ROCZNIKI HUMANISTYCZNE
Tom LXVI, zeszyt 7 – 2018
DOI: http://dx.doi.org/10.18290/rh.2018.66.7-12

NATALIA RUSIECKA

# АД БІЯГРАФІІ ДА АГІЯГРАФІІ: НЕКАТОРЫЯ ФАКТЫ З ЖЫЦЦЯ САФІІ СЛУЦКАЙ

Агіяграфічны жанр як від царкоўнай літаратуры ўзнік яшчэ ў Рымскай імперыі, працягваў развівацца ў Візантыі, а з цягам часу ахапіў усю Еўропу. Гісторыі пра жыццё святых, іх подзвігі, пакутніцкую ці праведную смерць, а таксама цуды, якія адбываліся яшчэ пры жыцці, але працягвалі здарацца і пасля смерці святых, былі аднымі з самых папулярных і распаўсюджаных твораў у сярэднявечнай літаратуры розных народаў. Прыгожае пісьменства Беларусі ўзбагачалася найперш перакладнымі жыццяпісамі святых, такіх як *Жыціе Аляксея, чалавека Божага*, *Жыціе Васілія Новага*, *Жыціе Андрэя Юродзівага*, *Жыціе Яўстафія Плакіды*. Гэта былі творы з разгалінаванымі займальнымі сюжэтамі, паколькі іх аўтары між іншага „шырока выкарыстоўвалі фабулы і прыёмы старажытнагрэчаскіх раманаў прыгод”[1].

У XII-XIII стагоддзях пачалі з’яўляцца і першыя ўласна старабеларускія творы, прысвечаныя мясцовым святым: Еўфрасінні Полацкай, Аўраамію Смаленскаму, Кірылу Тураўскаму. Падобныя тэксты ўзнікалі пераважна адразу пасля смерці святога, пакуль яшчэ ў памяці жывых альбо ў дакументах утрымлівалася біяграфічныя дадзеныя. І хаця аўтары не заўсёды дбалі пра дакументальную дакладнасць, ствараючы апісанне жыцця рэальнай гістарычнай асобы, аўтар міжволі занатоўваў факты з гі-

Dr NATALIA RUSIECKA – Zakład Białorutenistyki i Bułgarystyki Instytut Filologii Słowiańskie, UMCS, Lublin; e-mail: natalia.rusiecka@poczta.umcs.lublin.pl

[1] *Гісторыя беларускай літаратуры XI-XIX стагоддзяў*, т. 1: *Даўняя літаратура XI--першая палова XVIII стагоддзя*, рэд. В.А. Чамярыцкі, Мінск: Беларуская навука 2007, с. 33.

сторыі краіны, умацоўваў ідэі хрысціянскага служэння дзяржаве і чалавецтву, спрыяў выхаванню рэлігійных пачуццяў і фарміраванню маральных устояў у грамадстве.

У нашым артыкуле параўноўваюцца біяграфічныя звесткі пра Сафію Слуцкую, змешчаныя ў асобных польскіх і беларускіх літаратурных, ужытковых, навуковых і рэлігійных тэкстах, прысвечаных княгіні. Напісаныя ў розныя часы творы, якія адлюстроўваюць ў той ці іншай ступені жыццё і дзейнасць Сафіі Слуцкай, не заўсёды адпавядаюць рэальным фактам. Мы паспрабуем у першую чаргу выявіць памылкі і недакладнасці ў жыццяпісе княгіні, а таксама прасачыць, як тая ці іншая інфармацыя трансфармавалася, ігнаравалася ці выкарыстоўвалася рознымі аўтарамі на працягу некалькіх стагоддзяў, і якія факты нарэшце трапілі ў першы агіяграфічны тэкст, прысвечаны святой.

400 гадоў з дня смерці Сафіі Слуцкай – перыяд дастаткова працяглы, культура (літаратура як яе неад’емная частка) за гэты час перажыла не адну эпоху з уласцівымі кожнай з іх эстэтычнымі (а таксама этычнымі) канонамі. Літаратурнай гераіняй княгіня Слуцкая сталася яшчэ ў XVII ст., дзякуючы старанням таленавітых тагачасных паэтаў Даніэля Набароўскага[2] і Саламона Рысінскага[3]. Праз больш як два стагоддзі вобраз Сафіі Слуцкай уваскрасіў на старонках свайго рамана Юзаф Ігнацы Крашэўскі[4], драматургічны партрэт князёўны стварыў Уладыслаў Сыракомля[5]. Напрыканцы XX ст. у беларускай літаратуры да вобразу княгіні Слуцкай звярталася пісьменніца Людміла Рублеўская[6]. Такім чынам менавіта тэксты прыгожага пісьменства захавалі найбольш поўна біяграфічныя звесткі пра апошнюю прадстаўніцу роду Алелькавічаў, князёў Слуцкіх. З аднаго боку, гэта спрыяла таму, што памяць пра Сафію Слуцкую дайшла да нашых часоў, з другога боку, варта падкрэсліць, што літаратары часта па-свойму інтэрпрэтавалі тыя ці іншыя падзеі, блыталі даты і месцы,

[2] D. NABOROWSKI, *Wiecznej pamięci Oświeconej Księżnej Paniej Jej Mci Zofiej Słuckiej Radziwiłłowej Podczasynej W.Ks.L.*, [w:] TENŻE, *Poezje*, Kraków: Universitas 2003, s. 93; TENŻE, *Żałującemu zeszłej małżonki Radziwiłłowi*, там жа, s. 95; TENŻE, *Dafnis świętojański*, там жа, s. 78; TENŻE, *Nagrobek Lewusiowi kochanemu księżnej Zofiej na Słucku Radziwiłłowej*, там жа, s. 176.

[3] S. RYSIŃSKI, *Marmoris Inscriptio, Naenia, Cenotaphium*. Цытуецца па: А.А. СКЕП’ЯН, *Князі Слуцкія*, Мінск: Беларусь 2013, с. 201-202 (фотакопіі з, выдадзенага ў 1614 годзе. набор *Variorum monumentorum decas*).

[4] J.I. KRASZEWSKI, *Ostatnia z Książąt Słuckich* (1841).

[5] W. SYROKOMLA, *Księżniczka Słucka (Możnowładcy i sierota)* (1858).

[6] Л. РУБЛЕЎСКАЯ, *Апошняя з Алелькавічаў: драм. паэма: у 3 дз.* „Праваслаўе” 1998, № 7, с. 106-125.

таму сярод фактаў з жыцця княгіні сустракаецца значная колькасць памылак, якія, незаўважаныя і нявыпраўленыя, вандруюць з аднаго стагоддзя ў наступнае.

Афіцыйна да ліку праваслаўных святых Сафія Слуцкая была залічана ў 1984 г., і толькі на пачатку XXI ст. пачалі фарміравацца сучасныя мастацкія і папулярныя тэксты жыційнага характару[7]. Спробы першых агіяграфічных твораў пра княгіню Слуцкую датуюцца XIX ст., калі апісанне жыцця і смерці праведнай Сафіі было створана настаўнікам Слуцкай духоўнай семінарыі іераманахам Маркіянам[8]. Мінула яшчэ сто гадоў, і ў гонар 300-годдзя з дня смерці настаяцель Свята-Троіцкага манастыра ў Слуцку архімандрыт Афанасій (Вячорка) склаў невялікае жыціе Сафіі Слуцкай[9]. На жаль, мы не мелі магчымасці пазнаёміцца з гэтымі тэкстамі, невядома, ці друкаваліся яны і ці захаваліся да нашых дзён. Звесткі пра гэтыя тэксты пададзены аўтарамі кнігі *Святая праведная София, княгиня Слуцкая. Житийное повествование*, выдадзенай з нагоды 400-годдзя з дня смерці Сафіі ў 2012 г. без спасылак на дакладныя крыніцы.

Такім чынам, распачаўшы даследванні з фунеральных тэкстаў Даніэля Набароўскага[10] і Саламона Рысінскага[11], мы палічылі неабходным зверыць найбольш важныя даты і некаторыя факты з жыцця княгіні, змешчаныя ў прынагодных тэкстах пачатку XVII ст., з інфармацыяй, даступнай на сёння ў польскіх і беларускіх крыніцах, пакідаючы па-за ўвагай чыста літаратурныя творы XIX-XXI стст.

На падставе тэкстаў, якія пісаліся з нагоды заўчаснай смерці княгіні Слуцкай удалося высветліць наступнае. Пачнем ад **даты смерці Сафіі Слуцкай**. Ва ўсіх тэкстах згодна падаецца год – 1612. Канкрэтная дата на падставе прынагодных твораў Набароўскага і Рысінскага – 9 сакавіка.

**Umarła d.9 martii A[nn]o 1612**. – Naborowski, *Wiecznej pamięci…*[12]
**VII Id. Mart**. – Rysinski, *Cenotaphium*.

---

[7] *Святая праведная София, княгиня Слуцкая*, пересказала для етей О.В. Малишевская, Минск 2011; И. Масленицина, Н. Богодяж, *София Слуцкая*, Минск 2012 и др.

[8] И. Горбунов, Г. Щеглов, *Святая праведная София, княгиня Слуцкая. Житийное повествование*, Минск: Братство в честь Святого Архистратига Михаила в г. Минске 2012, с. 18.

[9] Там жа, с. 20.

[10] D. Naborowski, *Wiecznej pamięci Oświeconej Księżnej Paniej Jej Mci Zofiej Słuckiej Radziwiłłowej Podczasynej W.Ks.L.*; tenże, *Żałującemu zeszłej małżonki Radziwiłłowi.*

[11] S. Rysiński, *Marmoris Inscriptio, Naenia, Cenotaphium.*

[12] D. Naborowski, *Poezje*, Kraków: Universitas 2003, s. 94.

**Mart. D. IX** – Rysinski, *Marmoris Inscriptio*[13].

Гэтую ж дату падае таксама беларуская даследчыца Анастасія Скеп’ян[14]: „9 сакавіка 1612 г. памірае сама Соф’я”. На лацінскім надпісе да патрэта Сафіі Слуцкай з альбома *Icones familiae ducalis Radivilianae…*, выдадзеным Гіршам Ляйбовічам у Нясвіжы ў 1758 годзе, занатавана тая самая дата смерці – 9 Martyi 1612 г.

Іншую версію – 19 сакавіка 1612 – мы сустракаем у жыціі, выдадзеным Беларускай праваслаўнай царквой з нагоды 400-годдзя з дня смерці княгіні. Нібыта менавіта такая дата была запісана на ўнутраным баку цынкавай ракі: „1612, марта 19, преставися благоверная София”[15]. Версія 19 сакавіка сустракаецца таксама на шматлікіх афіцыйных праваслаўных сайтах[16]. Нідзе, на жаль, не падаецца крыніца, паводле якой цытуецца надпіс з ракі. Невядома таксама, хто і калі зрабіў гэты надпіс.

Да тэксту *Marmoris inscriptio* Рысінскага ёсць дадатак, у якім пазначана дата, калі цела княгіні было пакладзена ў Слуцкім манастыры – A.D. VI CAL. IUN. Даслоўна „за 6 дзён да чэрвеньскіх календ” то бок – 26 мая. Гэтая дата падаецца цалкам верагоднай, калі ведаць, што Януш Радзівіл (муж Сафіі Слуцкай) запрашаў Льва Сапегу на пахавальныя ўрачыстасці ў Слуцк на 28 мая. Да ліста князя Радзівіла звяртаецца ў сваім даследванні А. Скеп’ян[17] (с. 199).

Што тычыцца **даты нараджэння Сафіі Слуцкай**, то нідзе не захавалася дакладнага запісу пра час нараджэння князёўны. Большасць праваслаўных інтэрнэт-рэсурсаў найчасцей падаюць 1585 год, 1 мая. У „Жыціі” І. Гарбунова сустракаем дастаткова прыблізна акрэслены час нараджэння Сафіі: „… 6 мая 1586 года князь Юрий III скончался… [...] не успев увидеть дочь Софию, которая родилась спустя три месяца после его кончины”[18].

Мы вырашылі вылічыць дату нараджння на падставе ўскосных дадзеных, змешчаных у фунеральных тэкстах. Рысінскі ў *Marmoris Inscriptio* падае працягласць жыцця княгіні наступным чынам: 25 гадоў, 10 месяцаў, 6 дзён. Падобным чынам пададзена і працягласць шлюбу: 11 гадоў,

[13] См. зноску 3.

[14] А.А. Скеп’ян, *Князі Слуцкія*, с. 199.

[15] И. Горбунов, Г. Щеглов, *Святая праведная София, княгиня Слуцкая*, с. 16.

[16] http://sppsobor.by/bractva/vilna/laboratory/bellife/4029 [доступ: 09.02.2015]; http://www.blagobor.by/article/saint/sofia [доступ: 09.02.2015].

[17] А.А. Скеп’ян, *Князі Слуцкія*, с. 199.

[18] И. Горбунов, Г. Щеглов, *Святая праведная София, княгиня Слуцкая*, с. 6.

5 месяцаў, 8 дзён. І вось тут пачынаюцца пэўныя разбежкі. Нам дакладна вядома дата шлюбу – 1 кастрычніка 1600 г. Да гэтай даты дадаем 11 гадоў, 5 месяцаў і 8 дзён – атрымліваем 9 сакавіка. А вось калі адлічыць гады жыцця, то дата нараджэння прыпадзе на 3 мая 1586 г.

У дакументальным фільме *Сафія Слуцкая. Апошняя з роду Алелькавічаў* (2011, тэлеканал „ЛАД”) таксама згадваецца дата нараджэння княгіні 1 мая 1585 г.

А. Скеп’ян падае дату 1 мая 1586 года і нават удакладняе – дзень быў чацьвер. Пра што мае сведчыць ліст Ёзафа Быхаўца, які апісвае падзеі таго дня і які захаваўся да нашага часу[19].

На надпісе да патрэта з альбома *Icones familiae ducalis Radivilianae…* указаны толькі год нараджэння княгіні – 1586.

Паспрабуем падсумаваць:

**Найбольш верагоднымі датамі нараджэння і смерці княгіні Сафіі Слуцкай з’яўляюцца 1 мая 1586 г. і 9 сакавіка 1612 г.**

Адкуль жа ўзялася дата смерці 19 сакавіка ў некаторых крыніцах? Адказ на гэтае пытанне можа быць адзіна гіпотэзай. Вядома, што 15 кастрычніка 1582 Рэч Паспалітая перайшла на грыгарыянскі каляндар, але на працягу даволі значнага часу назіраецца блытаніна ў датах. Надпіс на цынкавай труне княгіні, магчыма, створаны з улікам 10 дзён розніцы паміж юліянскім і грыгарыянскім календарамі. Цікава звярнуць увагу яшчэ і на тую акалічнасць, што сёння Беларуская праваслаўная царква ўшаноўвае памяць княгіні Слуцкай 1 красавіка, далічыўшы да 19 сакавіка яшчэ чарговыя 13 дзён, якія на сённяшні дзень складаюць розніцу паміж юліянскім і грыгарыянскім календарамі.

Наступнымі біяграфічнымі фактамі, якія хацелася б удакладніць, з’яўляецца месца нараджэня і месца смерці княгіні.

**Нарадзілася Сафія ў Слуцку**. І тут ніякіх разначытанняў у тэкстах намі не выяўлена. Што датычыць смерці, то тут некалькі магчымых варыянтаў: **Омелево** – паводле Жыція[20]; **Амелянец** – паводле А. Скеп’ян[21].

Прыведзеныя версіі пададзены аўтарамі без дакладных спасылак на дакументы эпохі, таму пытанне застаецца пакуль адкрытым і патрабуе вывучэння. На альбоме радзівілаўскіх партрэтаў *Icones familiae ducalis Radivilianae…* пазначана наступнае месца смерці Сафіі: **In Omelonsa**. Можна меркаваць, што гэта і ёсць згаданы беларускай даследчыцай

[19] А.А. Скеп’ян, *Князі Слуцкія*, с. 154.

[20] И. Горбунов, Г. Щеглов, *Святая праведная София, княгиня Слуцкая*, с. 15.

[21] А.А. Скеп’ян, *Князі Слуцкія*, с. 199.

А. Скеп'ян Амелянец, які не пазначаны на сучасных картах Беларусі. Але ў выданні Польскага геаграфічнага слоўніка (*Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich*, 1880-1914) нам удалося знайсці цэлы шэраг мясцовасцяў з падобнымі назвамі: Omułyńce (Omelańce, Amlincy) вёска слуцкага павета; Omelno – царкоўная вёска ў луцкім павеце, Omelno – 1) вёска ў бабруйскім павеце, 2) вёска ў ігуменскім павеце, 3) Amelno – вёска ў пінскім павеце; Omelaniec – вёска ў наваградскім павеце.

Наступныя немалаважныя факты з жыцця Сафіі Слуцкай, на якія мы б хацелі звярнуць увагу, датычаць народжаных ёю дзяцей: колькі іх было, якога полу, калі нараджаліся і колькі яны жылі. Як вядома, дакладных запісаў нараджэння дзяцей (тым больш дзяўчынак) доўгі час не існавала ўвогуле, не пазначаліся ў сямейных магнацкіх хроніках нават больш істотныя даты – хросту немаўляці. Звязана гэта было не ў апошнюю чаргу з высокай дзіцячай смяротнасцю. Але пільны прыдворны паэт Даніэль Набароўскі занатаваў у пахавальным вершы *Wiecznej pamięci* тры няўдалыя спробы княгіні нарадзіць нашчадка Радзівілаўскага роду:

Dwanaście lat w małżeństwie niespełnam przeżyła,
A córkę Katarzynę najpierwszą powiła,
Lecz na swój żal, bom się jej nie obradowała,
Gdyż na świecie szesnaście godzin tylko trwała;
Drugi płód, ach, niestetyż nie oglądał słońca;
Z trzecim już radosnego wyglądając końca
Omyliła nadzieja i czas pożądany,
A mnie miasto połogu grób nagotowany[22].

Такім чынам, маем тры цяжарнасці цягам дванаццаці год жыцця ў шлюбе, з якіх толькі першая скончылася нараджэннем дзіцяці – гэта была дачушка Кацярына, якая жыла ўсяго 16 гадзін. На жаль, дакладныя даты першых цяжарнасцяў устанавіць немагчыма. У іншым жалобным тэксце – *Żałującemu zeszłej małżonki Radziwiłłowi* – паэт зноў згадвае, што апошняя цяжарнасць скончылася заўчаснымі родамі і смерцю дзіцяці і самой княгіні:

Słusznie wprawdzie narzekasz, bo któż więcej zgubił,
Jako kto przyjaciela, co go z serca lubił,
Więcej kto dwu zarazem, jak się tobie dzieje,
Boś pozbył i istoty, i pewnej nadzieje.
Teraz to zacne drzewo owoc wydać miało...[23]

---

[22] D. NABOROWSKI, *Poezja*, s. 94.
[23] Там жа, s. 95.

У папярэднім творы Д. Набароўскага (*Wiecznej pamięci…*) чытаем таксама радкі, створаныя ад імя памерлай (традыцыйны прыём фунеральнай паэзіі). Сафія звяртаецца да Януша з наступнымі словамі:

> ... ze mną to ustało,
> Co już domu ostatnią nadzieją być miało[24].

Гэтай „апошняй надзеяй” было, вядома, ненароджанае Сафіяй дзіця.

У розных крыніцах (Жыціе (с.15), Скеп’ян (с. 199), беларускія праваслаўныя сайты) можна сустрэць інфармацыю пра тое, што, нарадзіўшы дачку Кацярыну, княгіня памерла, а ў хуткім часе (праз 16 гадзін) памерла і нованароджанае дзіця. На лацінскім надпісе да партрэта Ляйбовіча змешчана наступная інфармацыя, датычная дзяцей княгіні: „Nicolai XII 1604, Catharinae 1608”.

На афіцыйных інтэрнэт-старонках Беларускай праваслаўнай царквы нам таксама трапіліся звесткі пра тое, што дзеці Сафіі Мікалай і Кацярына памерлі немаўлятамі, а нарадзіўшы мёртвае дзіця, княгіня і сама памерла 19 сакавіка 1612 г.[25]

Звернемся яшчэ раз да тэкстаў, напісаных сведкамі эпохі. У шэрагу прынагодных вершаў Д. Набароўскага захаваўся таксама нагробак, прысвечаны дачцэ Радзівілаў Кацярыне *Nagrobek Katarzynie Radziwiłłównie*:

> Janusza Radziwiłła tu leży kochanie
> Pierworodne, lecz teraz smutek i wzdychanie:
> Katarzyna, z dziadem swym w jeden grób włożona,
> Która z księżną na Słucku Zofiją spłodzona.
> Szesnaście tu na świecie godzin jej bytności,
> O nędzny wieku ludzki, o krótkie radości![26]

На жаль, нідзе не захавалася дакладнай даты гэтых смутных падзей. Традыцыя ж укладання цела памерлага немаўляці да пахаваных раней родзічаў – дзеда альбо бабкі – была дастаткова распаўсюджанай. Наўрадці б укладалі Кацярыну ў гроб дзеда, калі б яна памерла адначасова з маці. Звернем увагу на тое, што паэт піша пра дачку як пра першароднае дзіця князя Радзівіла, а ў надпісе з альбома Ляйбовіча запісаны сын Мікалай (1604), а потым дачка Кацярына (1608).

---

[24] Там жа, s. 93.
[25] http://www.blagobor.by/article/saint/sofia [доступ: 09.02.2015].
[26] D. NABOROWSKI, *Poezje*, s. 94.

А. Скеп’ян у сваёй кнізе пра князёў Слуцкіх падае наступныя звесткі – „2 мая Соф’я захварэла. Праз тыдзень у выніку хваробы яна на пятым месяцы параніла дзіця”[27]. Гаворка вядзецца пра 1602 год. Даследчыца спасылаецца на ліст Януша Радзівіла з Любліна да бацькі. Страчанае дзіця было хлопчыкам – што толькі ўзмацняла роспач маладога князя, выказаную ў лісце.

Магчыма, гэта была першая страчаная цяжарнасць Сафіі, якая акрамя гэтага ліста нідзе больш і не была занатавана, паколькі перарвалася заўчасна, але дакладна гэта сцвердзіць немагчыма, таксама як няма ніякай магчымасці падлічыць сёння, колькі цяжарнасцяў было ў княгіні Слуцкай. Дзякуючы радкам прыдворнага паэта вядома, што іх было тры. Сведчыць пра гэта і эпітафія Рысінскага на лацінскай мове, якую перакладаюць, як хто ўмее: Filio primo Suscepta Secundo abortium passa Tertio partui vicina[28]. Вядзецца тут пра тое, што першае дзіця было народжана, другое страчана, а трэцяе мелася быць. Тэкст узяты з лацінскай эпітафіі Рысінскага, якая была зроблена на мармуровай пліце, змешчанай на месцы пахавання княгіні. Пліта гэтая не дайшла да нашага часу, была знішчана, захавалася, аднак, копія, зробленая Сымонам Старавольскім і змешчаная ў кнізе *Monumenta Sarmatarum* (Kraków 1655).

У Радзівілаўскім архіве ў Варшаве захоўваецца іншая копія, паводле якой узрост княгіні запісаны як XXX, але гэта, хутчэй за ўсё, памылка перапісчыка, якая трапіла ў іншыя крыніцы. Гэтую ж копію з памылковай датай прыводзіць у сваім даследванні *Князі Слуцкія* і А. Скеп’ян. Яшчэ адна мармуровая пліта з лацінскім надпісам знаходзілася ў Кіева-Пячэрскім манастыры. З яе захавалася копія, зробленая манахам Афанасіем (Кальнафойскім), якая цытуецца ў *Жыціі*[29], паводле якой княгіня пражыла няпоўныя дваццаць шэсць гадоў.

Не бракуе ў розных крыніцах і іншай блытаніны, звязанай, напрыклад, з маці княгіні Сафіі. У адных згадваецца Барбара Кішчанка, у іншых – Кацярына[30], альбо Ганна[31], розныя сустракаюцца і даты яе смерці.

А вось дата і месца шлюбу Сафіі Слуцкай з князем Янушам Радзівілам не выклікаюць у навукоўцаў ніякіх спрэчак і згодна падаюцца ва ўсіх

[27] А.А. Скеп’ян, *Князі Слуцкія*, с. 192.

[28] Цыт. па: А.А. Скеп’ян, *Князі Слуцкія*, с. 202.

[29] И. Горбунов, Г. Щеглов, *Святая праведная София, княгиня Слуцкая*, с. 16.

[30] http://www.blagobor.by/article/saint/sofia [доступ: 10.02.2015].

[31] Genealogia Książąt Ich Mści Panów Radziwiłłów krótko opisana, AGAD, AR, dz. II, ks. 63, s. 57.

крыніцах. Шлюб адбыўся 1 кастрычніка 1600 г. у Брэсце. Аўтары жыція Сафіі выказваюць меркаванне пра тое, што вянчанне магло адбыцца ў Свята-Мікольскім саборы, на той час кафедральным праваслаўным храме горада[32]. Далей, разважаючы пра канфесійную прыналежнасць Сафіі Слуцкай, аўтары біяграфічных тэкстаў, прысвечаных святой, падаюць блытаныя звесткі пра веравызнанне і яе мужа. Дакладна вядома, што Януш Радзівіл, прадстаўнік біржанска-дубінкаўскай галіны роду Радзівілаў, быў кальвінам. Тым не менш, у розных крыніцах сустракаецца інфармацыя пра тое, што князь быў каталікам[33], а ў сувязі з міжканфесійным шлюбам (па розных версіях ці то праваслаўна-каталіцкім, ці то каталіцка-кальвінскім) мела месца ліставанне князя Януша з папам рымскім і карэспандэнцыя гэтая захавалася да нашага часу[34]. Зусім беспадстаўна выглядае згадка пра тое, што нібыта ў сувязі з гэтым міжканфесійным шлюбам узнікла карэспандэнцыя паміж канстанцінопальскім патрыярхам і рымскім пантыфікам[35].

Аўтары, перад якімі стаіць сёння задача стварыць жыційныя тэксты на патрэбы Беларускай праваслаўнай царквы, у першую чаргу павінны праверыць дакладнасць біяграфічных фактаў. Не заўсёды можна ў такой справе разлічваць на дапамогу даўніх гісторыкаў, якія прыводзяць недакладныя звесткі, зачэрпнутыя з плётак і пагалосак, як у сітуацыі з гісторыяй пра каханка Сафіі Слуцкай. Гісторыю пра шлюбную здраду Сафіі з татарынам Асмольскім занатаваў Валяр'ян Неканда-Трэпка ў сваім *Liber generationis plebeanorum* (1626), упершыню рукапіс быў выдадзены друкам у 1963 г. Гэтая прыгода паспрыяла на думку Трэпкі напісанню Набароўскім фрашкі *Пані*:

Z jedną panią w namiotku młodziana zostano,
Poimawszy nazajutrz utopić kazano.
Pojrzy idąc do stawu, a pani wyziera
Z okna. Krzyknie: „Ratuj mię, twój sługa umiera!"
Pani: „Już idź, boć moja łaska nie poradzi.
Po smacznym kąsku wody napić się nie wadzi"[36].

[32] И. Горбунов, Г. Щеглов, *Святая праведная София, княгиня Слуцкая*, с. 13.
[33] http://www.blagobor.by/article/saint/sofia [доступ: 10.02.2015].
[34] Гл. А.А. Скеп'ян, *Князі Слуцкія*, с. 180-184.
[35] http://www.blagobor.by/article/saint/sofia [доступ: 10.02.2015].
[36] D. Naborowski, *Poezje*, s. 60.

Польскія навукоўцы[37] то абвяргалі, то падтрымлівалі меркаванне Трэпкі пра тое, што выраз, выкарыстаны паэтам у фрашцы з 1614 г., жыў у народзе. Адно можна сцвердзіць напэўна: у тыя часы падобныя плёткі, як і рэальныя гісторыі, не былі рэдкасцю. Занятыя дзяржаўнымі справамі мужы часта выязджалі з дому, пакідаючы жонак пільнаваць гаспадарку, самі карысталіся паслугамі прастытутак, хварэлі на сіфіліс і прывозілі хваробу дадому. Рознае здаралася і з княгінямі. Ян Серэдыка ў сваёй кнізе *Księżniczka i chudopachołek* апісвае раман Сафіі з Радзівілаў Дарагастайскай з Станіславам Тымінскім, а пры нагодзе спрабуе ратаваць добрае імя Сафіі Слуцкай[38].

Падкрэсліць варта, аднак, што тагачасныя людзі цвёрда прытрымліваліся правіла, выказанага ў лацінскай максіме: *de mortuis aut bene aut nihil*. Таму ў пасмяротных вершах прысвечаных Сафіі Слуцкай безагаворачна ўхваляецца вернасць жонкі князя Радзівіла, а таксама іншыя цноты і дабрадзействы. Не толькі Рысінскі гаворыць ў *Кенатафе* пра Сафію „Fidissima consors matronarum sui secui si"[39] (найвярнейшая з усіх жонак свайго часу), але і невядомы аўтар тэксту *Mowa na pogrzebie Księżnej słuckiej, podczaszynej W.Ks.Lit.*[40] піша, што смуткуюць з нагоды смерці княгіні не толькі блізкія і далёкія родзічы, але і падуладныя: „Mają nawet wszyscy poddani wierni wielką przyczynę opłakiwania śmierci tej zacnej Księżny, ostatnie[g]o potomka domu Ks. Ich Mci Słuckich, gdy sobie wspomnią, jakie[g]o wczasu i pokoju, i dobrodziejstwa od PP swoich zeszłych pod fortunnym panowaniem Ich M., a osobliwie zmarłej Ks. Jej Mci zażywali"[41].

Беларускія даследчыкі працягваюць спрачацца наконт веравызнання Сафіі Слуцкай. Беларусь, яе культурныя і рэлігійныя традыцыі фарміраваліся паміж Усходам і Захадам. Дзяржаўныя эліты краіны часта змянялі свае ўпадабанні, належалі то да аднаго, то да другога палітычнага ці рэлігійнага лагера, часта гэта было непасрэдна звязана з іх палітычнымі

[37] Гл. J. Dürr-Durski, *Daniel Naborowski. Monografia z dziejów manieryzmu i baroku w Polsce*, Łódź: Zakład Narodowy im. Ossolińskich 1966; A. Sajkowski, *Od Sierotki do Rybeńki. W kręgu radiwiłłowskiego mecenatu*, Poznań: Wydawnictwo Poznańskie 1965; R. Grześkowiak, *Barokowy tekst i jego twórcy. Studia o edycji i atrybucji poezji „wieku rękopisów"*, Gdańsk: Wydawnictwo Uniwersytetu Gdańskiego 2003; M. Jarczykowa, *Przy pogrzebach rzeczy i rytmy. Funeralia Radziwiłłowskie z XVII wieku*, Katowice: Wydawnictwo Uniwersytetu Śląskiego 2012.

[38] Гл. J. Seredyka, *Księżniczka i chudopachołek. Zofia z Radziwiłłów Dorohostajska i Stanisław Tymiński*, Opole: Wydawnictwo Uniwersytetu Opolskiego 1995.

[39] Цыт. за: А.А. Скеп'ян, *Князі Слуцкія*, с. 202.

[40] Гл. M. Barłowska, *Swada i milczenie. Zbiory oratorskie XVII-XVIII wieku – prolegomena filologiczne*, Katowice: Wydawnictwo Uniwersytetu Śląskiego 2010, s. 77.

[41] Цыт. за: M. Jarczykowa, *Przy pogrzebach rzeczy i rytmy*, s. 104.

поглядамі. Здаралася, што адзін чалавек за жыццё паспяваў тройчы змяніць веравызнанне.

У адносінах да Сафіі Слуцкай найчасцей агучваецца гіпотэза яе прыналежнасці да каталіцызму. Грунтуецца падобнае меркаванне на агульнай для тых часоў традыцыі: калі бацькі належалі да розных веравызнанняў, то сыноў хрысцілі ў бацькаву веру, а дзяўчынак – у матчыну. Вядома, што маці Сафіі – Барбара з Кішкаў была каталічкай, бацька ж быў апошнім праваслаўным прадстаўніком слаўнага роду Алелькавічаў. Калі нарадзілася дачушка Сафія, князь Юры ведаў, што памірае, і мог прасіць, каб адзінае яго дзіця было хрышчана паводле праваслаўнага абраду. Гіпотэзы можна множыць, але яны застануцца толькі гіпотэзамі да таго часу, пакуль не будзе знойдзена ім дакументальнае пацверджанне. На сённяшні дзень дакладна невядома, ні ў якім храме хрысцілі княжну, ні ў якім храме адбыўся шлюб Сафіі Слуцкай з Янушам Радзівілам.

У жыційнай літаратуры акрамя дакладных біяграфічных звестак традыцыйна апісваюцца цуды, якія адбываліся пры жыцці і пасля смерці святога. Жыціе Сафіі Слуцкай, выдадзенае ў 2012 г., утрымлівае інфармацыю пра заступніцтва княгіні і абарону жыхароў Слуцка падчас напалеонаўскай кампаніі 1812 г., паўстрыманне эпідэміі халеры на Случчыне ў 1848 г., распавядаецца пра дапамогу святой Сафіі хворым і нядужым, а таксама цяжарным жанчынам[42]. І хоць цуд – гэта найперш пытанне нашай веры, хацелася б мець пэўнасць, што і гэтым незвычайным здарэнням ёсць дакументальнае пацверджанне.

З красавіка 1984 г. на падставе рапарта мітрапаліта Мінскага і Беларускага Філарэта праваслаўная царква афіцыйна кананізавала Сафію Слуцкую і далучыла да Сабору Беларускіх Святых, а 1 красавіка адзначаецца дзень яе памяці. Нятленныя мошчы святой захоўваюцца ў Свята-Духавым кафедральным саборы г. Мінска, у 2011 годзе ў Мінску было завершана будаўніцтва царквы, асвечанай у гонар Сафіі Слуцкай. Нам хочацца спадзявацца, што ўсе памылкі ў біяграфічных звестках Сафіі Слуцкай у афіцыйнай праваслаўнай і гістарычнай літаратуры будуць выпраўлены, а на падставе правераных і, магчыма, новаадкрытых фактаў будзе створана дакладнае жыццяапісанне беларускай святой. Менавіта дакладная біяграфія і паслужыць тым трывалым падмуркам, на якім змогуць будавацца тэксты агіяграфічнага жанру.

---

[42] И. Горбунов, Г. Щеглов, *Святая праведная София, княгиня Слуцкая*, с. 18-22.

## БІБЛІЯГРАФІЯ

*Гісторыя беларускай літаратуры XI-XIX стагоддзяў*, т. 1: *Даўняя літаратура XI-першая палова XVIII стагоддзя*, рэд. В.А. Чамярыцкі, Мінск: Беларуская навука 2007.

ГОРБУНОВ И., ЩЕГЛОВ Г., *Святая праведная София, княгиня Слуцкая. Житийное повествование*, Минск: Братство в честь Святого Архистратига Михаила в г. Минске 2012.

СКЕП'ЯН А.А., *Князі Слуцкія*, Мінск: Беларусь 2013.

BARŁOWSKA M., *Swada i milczenie. Zbiory oratorskie XVII-XVIII wieku – prolegomena filologiczne*, Katowice: Wydawnictwo Uniwersytetu Śląskiego 2010.

DÜRR-DURSKI J., *Daniel Naborowski. Monografia z dziejów manieryzmu i baroku w Polsce*, Łódź: Zakład Narodowy im. Ossolińskich 1966.

Genealogia Książąt Ich Mści Panów Radziwiłłów krótko opisana, AGAD, AR, dz. II, ks. 63.

GRZEŚKOWIAK R., *Barokowy tekst i jego twórcy. Studia o edycji i atrybucji poezji „wieku rękopisów"*, Gdańsk: Wydawnictwo Uniwersytetu Gdańskiego 2003.

JARCZYKOWA M., *Przy pogrzebach rzeczy i rytmy*, Katowice: Wydawnictwo Uniwersytetu Śląskiego 2012.

NABOROWSKI D., *Poezje*, Kraków: Universitas 2003.

SAJKOWSKI A., *Od Sierotki do Rybeńki. W kręgu radziwiłłowskiego mecenatu*, Poznań: Wydawnictwo Poznańskie 1965.

SEREDYKA J., *Księżniczka i chudopachołek. Zofia z Radziwiłłów Dorohostajska i Stanisław Tymiński*, Opole: Wydawnictwo Uniwersytetu Opolskiego 1995.

Сайт Борисовского благочиния: http://www.blagobor.by/article/saint/sofia

Сайт Свято-Петро-Павловского собора в Минске: http://sppsobor.by/bractva/vilna/laboratory/bellife/4029.